Янка Сіпакоў



...у мае лясы сёньня з усіх канцоў
угрызаюцца бензапілы...

# На мядзьведзя, з рагацінай

***З цыклу «Экстрэмальныя апавяданьні»***

— Назад!

Я падсьвядома, міжволі падпарадкоўваючыся нейчаму крыку, зрабіў крок назад і толькі тады ўбачыў, што на мяне падае вялікая, тоўстая, вельмі сукаватая елка...

Першы баравічок я заўважыў выпадкова — ужо быў прайшоў яго, мінуў тое месца, дзе ён ускочыў, і толькі азірнуўшыся, убачыў, як з-пад ялінкі, яшчэ ня стросшы з сябе брылёк зямлі ды ігліцы, цікаўна выглядае сьветлакарычневая шляпка — нібыта грыбок усё яшчэ адважваецца, вылазіць яму зусім ці не.

Вярнуўся, укленчыў, стаў перад баравічком на калені, асьцярожна даланёю ссунуў з капялюшыка зямлю з ігліцай і нахіліўшыся, не беручы крапячка ў

рукі, пацалаваў яго — кажуць жа, што грыбоў звычайна знаходзіш столькі, колькі разоў пацалуеш першага.

Не ўстаючы з каленяў, не дастаючы з зямлі прыгажуна, агледзеўся.

Ого, дык ён жа тут не адзін! Бачыш, і вунь там, пад галінкаю, і вунь там, узбоч вялікай яліны... І вось тут, амаль у цябе пад носам, на голым месцы, на подсьціле з ігліцы, зірні, стаіць самы прыгожы і самы вялікі баравік.

І ўсе яны — нібы браты, нібы двайняты, нібы радня. Усе як на падбор, усе падобныя адзін да аднаго. Стаяць, задзёршы галовы, — бы суслікі над сваімі норкамі.

І мне ўжо здаецца, што яны выскокваюць з зямлі на маіх вачах.

Колькі я папахадзіў па лесе да гэтага, але сапраўдных баравікоў нават і ня бачыў. Шмат сустракаў палявых баравікоў, ці, як у нас кажуць, чорнагаловікаў, аднак усе яны былі паточаныя, чарвівыя.

Былі «зонцікі», якія ў нас з нядаўняга часу пачалі браць — я ж імі грэбую: і падобныя яны на каровіны аладкі, і на патэльні разлазяцца, як кархавіньне, і салодкія вельмі, а я люблю, каб грыб быў цьвёрдзенькі і пах грыбам.

Трапляліся і капыты — сьвінушкі, на якіх я, можна сказаць, вырас: у дзяцінстве насіў іх з лесу кашамі і сам смажыў. Капыты ў нас бяруць і цяпер, вымочваюць і соляць, аднак я, прачытаўшы недзе, якія яны атрутныя і шкодныя, абыходжу іх, не чапаючы.

А тут баравікі! Ды такія чысьценькія, прыгожанькія, роўненькія. Ды так многа!

Я доўга стаяў на каленях і, ахоплены нейкім дзіўным пачуцьцём замілаваньня і радасьці, ня мог адарваць вачэй ад палянкі, на якой яны расьлі.

Недзе далекавата адсюль прыглушана, натужна гулі, часам зрываючыся на пранізьлівы віскат, бензапілы.

Мой родны зубрэвіцкі лес выразаюць — на мае зялёнакрылыя ельнікі напаў нейкі бязьлітасны, пражорлівы караед: залазіць пад кару здаровых дрэваў, выточвае аж да самых верхавінаў сабе хады, ператвараючы зялёныя яліны ў сухастоіны.

Аддзярэш часам тоўстую і, здаецца, яшчэ жывую карыну здаровага жывога дрэва, і ўбачыш, як пад ёю заварушацца, раззлавана забегаюць караеды, а на сухастоіне ўжо нікога ня згледзіш: каму трэба мёртвае дрэ-ва — яны зрабілі сваю справу і сышлі на іншыя дрэвы.

З мёртвых дрэваў назаўсёды зьлятаюць птушкі — у сухім гольлі ўжо не схаваеш гнязда: яны робяцца адусюль бачнымі ў лесе.

Пакідаюць свае дыхтоўныя мурашнікі мурашы, якія яны будавалі яшчэ пры жывых дрэвах і якім, здавалася, нічога не пагражала.

Колькі такіх пакінутых, да жудасьці аціхлых мурашнікаў маркоціцца цяпер пад сухадрэвінамі!

Толькі што я, дужа засумлёны, доўга стаяў каля аднаго з іх.

Мурашнік палохаў сваім маўчаньнем, цішынёю і спакоем: на ім нічога не варушылася.

Звычайна мурашы заўсёды працуюць бясшумна, але ж вочы бачаць, як яны мітусяцца: нехта прыбірае з дарогі ігліцу, нехта ад самай зямлі

пачынае ўсьцягваць яе на мурашнік, нехта хапае ігліцу, якая і ляжала, здаецца, на месцы, і пераносіць яе ў другі куток — што ж, яму відней, дзе гэтая ігліца больш патрэбная.

Уторкнуў у мурашнік пруток. Ціха. Ніякага руху, ніякага сполаху. А як бы яны той жа час абляпілі гэты пруток, як бы забегалі па ім на жывым мурашніку!

Усунуў руку ў ігліцу — пуста, мокра, няўтульна. А як бы захваляваліся яны, спрабуючы разабрацца, што ж гэта такое здарылася!

Разгроб мурашнік — пуста, ніводнай жывой душы. Чорная, мокрая ігліца. Халодная, нікому не патрэбная куча сьмецьця.

А нядаўна ж гэта была такая ўтульная хата, такое зручнае і дыхтоўнае жытло. З цудоўнай вентыляцыяй, з рэгулюемай тэмпературай паветра.

І як бачыш — усяго толькі горка ігліцы...

Падумалася: такой жа можа стаць і нашая хата, вёска, горад і ўрэшце, ўся планета Зямля, калі іх змушана пачнуць раптам пакідаць людзі...

Захацелася тут жа знайсьці, каб убачыць і ўзрадавацца, жывы мурашнік, па якім бы бегалі, спакойна мітусіліся радасныя ад сваёй сілы, ад працы ўпэўненыя ў сваёй нязводнасьці мурашы.

Мурашнік, на якім варушыцца ўся паверхня.

Пошукі яго і вывелі мяне на гэтую грыбную паляну.

Мурашы папакідалі свае дасканалыя, бездакорныя мурашнікі і кудысьці сышлі — мусіць, шукаюць больш надзейныя месцы для сваіх новых селішчаў.

Яны пакуль што яшчэ ня ведаюць, што такіх месцаў у маім зубрэвіцкім лесе ўжо няма.

Мой зубрэвіцкі лес асуджаны. Той лес, які садзіўся і да мяне, і пры мне, які я помню гэтакім юнаком, у якім у мяне было столькі дрэваўсяброў, цяпер бязьлітасна выразаецца. Ня ведаючы, як і чым змагацца з караедам-тыпографам, лесаводы прыйшлі да высновы, што найлепш выразаць усе ельнікі-хвойнікі.

А на іх месцы пасадзіць лістоўнікі.

Мае Зубрэвічы спрадвек былі аточаныя зялёнымі яловымі лясамі. Мы прывыклі да іх і кожнаму, хто ўваходзіў у свой ельнік, калючыя лапкі здаваліся мяккімі, ласкавымі, нават пушыстымі. Як адвыкнуць ад іх і прывыкнуць да лісцёвых гаёў і дуброваў?! І калі ж гэта будзе? Дубы ж растуць так ня скора...

А ў мае ж лясы сёньня з усіх канцоў угрызаюцца бензапілы — з-пад Дубраўкі і Казек, з-пад Белева і Вярхоўя.

— Страшна глядзець на лес, — пацепваюцца зубраўцы. — Так ужо выразалі, што і Навасельле, і Тумінічы вунь сталі відаць.

Якраз пад Вярхоўем, на палянцы, усланай лісьцём, ігліцаю, дробнымі сучкамі, дзе няма травы і нават заечай капусты, стаю я наўколенцах і любуюся баравікамі.

Непадалёку, захлынаючыся ад пілавіньня, не пасьпяваючы яго выплёўваць, вішчаць бензапілы.

Гэты край лесу купіў нейкі прадпрымальнік. Ен рэжа зубрэвіцкія дрэвы, расьпілоўвае на сваёй пілараме і прадае аж у Фінляндыю...

Дзіўна, Фінляндыя ці ня самая багатая на яловыя дрэвастоі краіна ў

Еўропе, а, бач ты яе, купляе ў маім лесе яліны. Свой лес яны берагуць, а мой — вязуць да сябе: наперад думаюць пра нашчадкаў. Вядома, пра сваіх — не пра нашых жа яны будуць клапаціцца.

...Спалоханыя лесарубы адразу ж з бензапіламі падбеглі да мяне.

— Ты жывы? — яшчэ здалёк спыталіся яны.

Я ляжаў пад магутнаю верхавінаю елкі, прыціснуты тоўстымі сукамі да зямлі.

Лесарубы ішлі да мяне, абразаючы сукі, якія заміналі ім рухацца хутчэй.

— Паварушы нагою! — ужо нагнуўшыся нада мною, загадаў адзін з іх.

Я паварушыў.

— Выцягвай яе скоранька! — прарэзьліва закрычаў другі.

Але нага не выцягвалася — яе моцна прыціснуў такі ж па таўшчыні, як і нага, сук.

Лесарубы, сьпяшаючыся, з двух бакоў выразалі з елкі нада мною кругляк з тым сукам, які прыціснуў нагу, і не бяз цяжкасьцяў адкінулі яго на недалёкі падлесак — сук спружыніў і калодка ўсё спрабавала зваліцца, вярнуцца на сваё ранейшае месца.

Я паспрабаваў устаць. Абапёрся праваю рукою на зямлю, войкнуў і зноў паваліўся пад елку.

— Ключыца пераламаная, — асьцярожна памацаўшы маё плячо, заўважыў, вальшчык, які быў бліжэй да мяне.

Лесарубы дапамаглі падняцца, стаць на ногі.

Я яшчэ памкнуўся быў сам ісьці дадому, аднак рабочыя не пусьцілі:

— Куда ты такі...

Ногі дрэнна трымалі мяне. Да таго ж я адчуў, што нешта цёплае і ліпкае цячэ па маім твары за каўнер і ўжо там халодзіць цела.

— Вялікая рана на галаве, — перагаворваліся між сабою лесарубы. — Шмат крыві губляе.

Адзін з іх зьняў з сябе паласатую матроскую майку, падраў яе і паклаў зьверху мне на галаву. Другі знайшоў пад елкаю маю кепку і прыціснуў ёю акраўку.

У такім выглядзе я сяк-так з дапамогаю лесавалаў дайшоў да іхняга матацыкла.

Ішоў дождж, але не зважаючы на яго, за вёскаю гуў камбайн — зубраўцы ў гэты дзень малацілі свае ячмені. І чалавек, які прывёз дадому ўжо сыраватае зерне на старым «фордзе», сказаў:

— Нікога я і нікуды не павязу, пакуль не перасыплю з прычэпу ў цяпліцу ячмень.

Ружу ў адной з палатаў траўматалагічнага аддзяленьня Аршанскай гарадской бальніцы імя Сямашкі, куды мяне паклалі, спачатку я не заўважыў.

Тады я, шчыра кажучы, нічога не заўважаў, ні на што не зьвяртаў увагі. Усё, што адбывалася вакол мяне, — людзі, якія рухаліся недзе побач, размовы, што чуў скрозь мясцовы наркоз, дзеяньні, якія рабіў сам, і якія

загадвалі мне рабіць іншыя, — усё гэта зьлівалася, зьвівалася, злучалася ў адзін, мусіць, нейкі невядомы для іншых і рэальны толькі для мяне аднаго клубок, які, нібы ў кокан, прыняўшы мяне ў сябе, каціўся невядома куды.

Нехта сшываў мне рану на галаве, зьдзіўляючыся, што ўпершыню ў яго ірвуцца ніткі; нехта з-пад майго твару — я ляжаў ніцма — выграбаў густую кроў, якою я захлынаўся; нехта вазіў мяне, скрываўленага, па паверхах на бразгатлівай жалезнай каталцы; нехта рабіў рэнтген галавы, нагі, ключыцы; нехта перавязваў рану, накладаў гіпс на плечы.

Ды і прачнуўшыся назаўтра ў палаце, я заўважыў найперш ня ружу, а ў вочы мне адразу ж кінуліся дзьве вутачкі — белая і сіняя, — якія, паслужліва выцягнуўшы насы, разам месьціліся на табурэце каля майго ложку, гатовыя дапамагаць адразу ж.

Ружа, перавітая блакітнаю стужкаю, цёмнабарвовая, моцная, з зялёным мясістым лісьцем стаяла ў адрэзанай пластыкавай бутэльцы з-пад мінеральнай вады «Дарыда» каля ложку майго суседа зьлева, і я падумаў, што гэтую кветку прынёс нехта з тых, хто да яго прыходзіў.

Сусед яшчэ сьпіць — з шырока адкрытым ротам, нязручна задраўшы галаву. Ляжыць ён на сьпіне. Правая нага яго — на выцяжцы: галёначная костка наскрозь прасьвідраваная, у дзірку ўстаўленая металічная рамачка, за якую прымацаваны груз, што зьвісае ўжо за ложкам.

На прыўзьнятую над пасьцельлю нагу, як панчоха, насунуты ці то рукаў, ці то калашына з нейкай блакітнай дзіцячай футболкі — ужо ж восень, і нага, якая столькі ляжыць бяз руху, вядома, застывае. Паміж вуткамі на яго табурэце стаіць карычневая бляшанка з-пад кавы. Усьміхнуўся — нечаканы па колерах нацюрморт: белае, сіняе, цёмнабарвовае і карычневае... Потым зразумеў, навошта на табурэце знайшлося месца для бляшанкі з-пад кавы.

Уночы я прачнуўся ад няяркага сьвятла, якое то ўспыхвала над суседавым ложкам, то на нейкі час затухала — сусед задумліва, не сьпяшаючыся, курыў.

Пстрыкала запальнічка і таксама ўспыхвала сьвятло над ложкам другога майго суседа, які ляжаў ля акна справа. Яго нага таксама была пад грузам, на выцяжцы, і ён нярэдка ўночы, голы да поясу, нечакана падхопліваўся і, чапляючыся за металічныя пруты, як Тарзан, завісаў над ложкам — маладое цела — Ігар быў самы малады між намі — не хацела мірыцца з нерухомасьцю і так разьюшана пратэставала супраць таго, што было непазьбежным.

Да Ігара са свайго кутка вельмі часта падбягаў дзед Міша Сініца, які таксама курыў, — свае цыгарэты ў яго былі, а вось запалак не было.

Прачнуўшыся, падхопліваўся з ложку егер Андрэй, які ляжаў паміж Сініцам і Ігарам, пераймаў старога, адною, здаровую рукою выхоплівае з роту ў яго прыпаленую ўжо цыгарэту, кідаў на падлогу, затоптваў нагамі і крычаў:

— Дакуль ты будзеш бегаць, дакуль будзеш курыць?!

Андрэй не курыў. І калі з тым, што ў палаце, не хаваючыся ні ад кога, курацъ Ігар і Мікалаевіч, ён мірыўся — яны ж, прывязаныя да ложкаў, іх ня выганіш, — то з дзедам Мішам змагаўся бязьлітасна: ты ж хадзячы, ідзі пакуры на лесьвічнай пляцоўцы, ці ў прыбіральні...

Як высьветлілася потым, і запалкі ў Сініцы выкраў знарок егер. Калі ж дзед усё-ткі нейкім чынам прыкурваў, егер, нібыта ўжо здаўшыся, не крычаў, а толькі цяжка ўздыхаў:

— Ну і палажылі ж мяне, ну і палажылі: адзін курыць, а другі яшчэ і кашляе.

Ігар, памочнік машыніста на чыгунцы, і, праўда, вельмі моцна, натужна і часта кашляў. Пасьля аўтамабільнай аварыі, якая паклала яго ў бальніцу, загусьцелая кроў трапіла ў лёгкія і, выклікаючы нейкі безвыходны кашаль, ніяк не адкашлівалася.

Маці і бацька, усе, хто прыходзіў да яго, прыносілі Ігару шмат рознакаляровых шарыкаў. Спачатку я думаў, што гэтыя шарыкі носяць яму, такому даросламу, на забаву, а потым зразумеў: яны яго лекі, доктар раіў яму часьцей надзьмуваць іх, каб ачышчаць лёгкія.

Ігар надзьмуваў іх цэлы дзень, і яны часта лопаліся — нібыта нехта ў палаце страляў.

Прахопліваўся егер Андрэй, садзіўся на ложку і нібыта некаму скардзіўся:

— Ну во, яшчэ і страляюць над самым вухам...

Сам Андрэй у траўматалогіі лячыў пераламаную ў плячы руку — ехаў на сваёй егерскай кабылцы Сучцы, тая чагосьці ўпудзілася і скінула яго з сябе.

— Ну і Сучка, ну і Сучка! — аж заходзіўся ён ад злосьці. — Ды я ж, як вярнуся, яе сваімі рукамі задушу!

А калі трохі адыходзіў, спакайнеў, супакойваўся:

— То ж трэба так зьняславіла мяне... — і тут жа зноў пераходзіў на крык: — Ды каго?! Лепшага егера Бабынавіцкага лясніцтва! Ці бачылі вы яго — з кабылы зваліўся! Руку зламаў! Ганьба!

Незнаёмым людзям сваё калецтва ён тлумачыў па-іншаму:

— Ведаеце, я егер. Хадзіў на мядзьведзя з рагацінай. І мядзьведзь мяне крышачку зачапіў.

Егер у палаце сумаваў, нудзіўся — там, у навакольных вёсках, якраз усе капаюць бульбу, і таму на волі і ён, і яго кабылка якраз былі б нарасхват.

Андрэй быў у гіпсе, але ўсюды хадзіў сам. Адной рукою сваю пасьцель ён сьцягнуў да ўзгалоўя — і матрац, і падушкі, і коўдры — і таму спаў амаль седзячы. За гэта на яго не сварыліся ні медсёстры, ні нават загадчык траўматалогіі, калі рабіў са сваёй сьвітаю – усе ў бялюткіх, накрухмаленых каўпаках! — свой традыцыйны ранішні абход: чалавеку так зручней, то хай так і будзе...

Часам Андрэй пачынаў гаварыць нібыта сам з сабою — ціха, спакойна, заплюшчыўшы вочы. Тады здавалася, што ён трызьніць, ні да кога не зьвяртаючыся, ні на кога ня гледзячы, — толькі нешта бубніць сабе пад нос. Усе мы сьцішваліся, замаўкалі і моўчкі слухалі яго аднаго.

— Мяне шмат чаму вучылі старыя егеры, бяз іх бы я многага ня зьведаў. Не, можа б, што і зразумеў, але ж не адразу і ня так, як з іхніх словаў і парадаў навучыўся. Я ж яшчэ самога дзеда Лесавіка ў лясьніцтве засьпеў — таго, што і напраўду на мядзьведзя з рагацінаю ў свой час хадзіў. Ён мяне папярэджваў: «Андрэй, ніколі ня вер мядзьведзю. Ён, хоць і здаецца цельпукаватым, а на самой справе — хітры. У бярлогу нярэдка задам заходзіць. Гэта каб нас людзей абдурыць: у бярлозе ўжо, маўляў, нікога няма — ён, касалапы, бачыце, выйшаў. Вунь жа сьляды. А таптун перад бярлогаю ўскочыць на паваленае дрэва, пройдзе па ім, а тады саскочыць і задам, задам да самага берлагу па сьнезе тупае. Таму нават егеры, якія ня ведаюць гэтага, часам дзівяцца: як гэта так атрымалася, што з адной бярлогі два мядзьведзі выйшлі.

А Вавула, другі егер, які вучыў мяне, яшчэ і цяпер жыве. Неяк я еду раніцою на сваёй кабылцы, яшчэ толькі ў лес еду, а ён ужо косіць. Ды і шмат выкасіў. А яму ж каля дзевяноста гадкоў. «Як гэта вы, дзед, управіліся столькі гахнуць? — спытаўся я. — Яшчэ ж рана». — «А я не глядзеў, рана ці позна. Сонца ўстала, і я ўстаў», — усьміхаўся мне Вавула...

Мы ляжалі на сваіх ложках і нават не варушыліся — баяліся спудзіць медытатыўны аповед егера. Нават Мікалаевіч, які ўвесь час свой аддаваў красвордам, — усё ж хутчэй праходзіць дзень для чалавека, навязанага за нагу, — адкладаў убок сканворды і, таксама заплюшчыўшы вочы, слухаў Андрэя.

Мы ўжо ведалі, што Бабынавіцкая паляўнічая дача ці ня самая багатая ў акрузе на дзічыну, што ў тых лясах ёсьць і мядзьведзі, і ваўкі, і ласі, і дзікі, і што яны, егеры, ладзяць паляваньні для іншаземцаў.

Разумеючы, што нам хочацца спытаць, чаму ён у нашых пушчах наладжвае паляваньні толькі для чужынцаў, егер адразу ж усё тлумачыць сам:

— Нават той жа самы дзік, якіх шмат разьвялося ў нашых лясах, каштуе добрых грошай. Трэба даляры! А ў мясцовых паляўнічых даляраў няма. Толькі вецер у кішэнях! Таму і палююць у Бабынавіцкай дачы адны немцы ды палякі. А хутка ў нашыя лясы нашых людзей з нашымі дубальтоўкамі і ўвогуле ня пусьцяць. Шчыты паставяць: «Беларусам уваход забаронены!» Нейкія багачы вялікім прысілам хочуць купіць нашую паляўнічую дачу. Усё робяць, каб нашага дырэктара вытурыць, свайго чалавека паставіць, а ён тады ім усё папрадае. Мы ж, егеры, ня хочам на нейкага пана рабіць. Дзяржава – яна заўсёды ласкавейшая, чымся нейкі пан. А паноў мы пакуль што венікамі сьцябаем. У лазні. У Польшчы ж кожны пан. Аднаму такому я ўжо сьпіну так адхвастаў, венік гальнём зрабіўся, а тады і кажу яму: «Пераварочвайся, пан. Другі егер, што вунь з новым венічкам стаіць, па ўзрэхах пройдзецца».

Пасьля нашай працы ён скаціўся далаўкі і крычыць: «Цяпер я ведаю, чаму рускія менш хварэюць за нас, палякаў». А мы за яго і зноў на палок. «За што?»— брыкаецца. «А за тое, каб адрозьніваў беларусаў ад рускіх, — адказваем мы яму. — І будзем сьцябаць цябе, пакуль не зразумееш, што ў Беларусі хвошчуць беларускімі венікамі беларускія егеры».

У палату санітаркі прыцягнулі каталку, ускацілі на яе дзеда Сініцу — мяне толькі зьдзівіла, навошта каталка: ён жа сам ходзіць! — і некуды павезьлі.

— А то гэтаю зімою, — не зважаючы ні на што, нібыта ня бачачы, што робіцца вакол яго, расказваў егер далей, – палявалі ў нас немцы. На аднаго з іх, які сядзеў у засадзе, мы выгналі лася. Ён прайшоўся перад немцам па паляне, а той і не шманае — маўчыць, не страляе. Тады мы самі падстрэлілі лася і, параненага, зноў на немца выгналі. Той на гэты раз, нібы прачнуўшыся, стрэліў, і лось адразу ж упаў на калені. Мы падбеглі да немца, віншуем, а той сядзіць сумнаваты і разгублена так пытае: «Дык хто ўсё ж забіў лася?»

— Хлопчыкі, укольчыкі! — вельмі зычным і нават гульлівым голасам успаміны егера перапыніла медыцынская сястра, якая з падносам запакаваных аднаразовых шпрыцоў імкліва ўвайшла ў палату.

І ўсе мы, яе хлопчыкі, пачалі нехаця, моўчкі вызваляць тое месца, куды звычайна даюць уколы. Пасьля шпрыцаваньня крыху памаўчалі — уколы ў траматалогіі ўсё ж вельмі балючыя.

Першым азваўся Мікалаевіч:

— Бач ты іх — немцы ўжо ў нашых лясах партызаняць. Жывёлаў нашых страляюць...

— Дык яны ж цяпер у нас усюды, Мікалаевіч, – падтрымаў такі працяг размовы Андрэй. — Вунь у Солаўі немец увесь калгас купіў. Гаспадар быў харошы, але ж дужа па-мацернаму брыдка лаяўся. Абяцаў усіх гультаёў каля сабачай будкі на ланцуг пасадзіць. Не спадабаўся ён людзям. Прагналі. Той перапрадаў Солаўе іншаму немцу. Новы гаспадар быў чалавек харошы, ужо не мацюкаўся, але ж піў не па-нямецку. І таму кукуруза, уся чорная, стаіць, бульба не пакапаная ў вадзе мокне, капусту сьнегам занесла. Яно і немцы розныя бываюць. А што ласёў страляюць... — егер пацёр пальцамі здаровай рукі, — дык яны ж за гэта плоцяць. Ды і зьвяроў жа ў нашых лясах разьвялося столькі, што іх хопіць і на немцаў, і на нас, і яшчэ застанецца. Многа зьвяроў напладзілася... Ведаеш, Мікалаевіч, — Андрэй неяк памядзьведжаму павярнуўся да майго суседа, — я ў сваім лесе дупло з пчоламі высачыў. Думаў, увосень мёд дастану. Дзе там! Ласка залезла, паела пчол, паела мёд і сьпіць сабе ў дупле. Я, раззлаваўшыся, там яе сонную і застрэліў...

Можа б Андрэй і далей успамінаў свае лясныя гісторыі, але тут у палату зайшла дзяўчынка гадоў трынаццаці — унучка Сініцы прыходзіла ў бальніцу амаль кожны дзень і заклапочана карміла дзеда, як кажуць, з рук. Часам яна прыходзіла адна, часам з сяброўкамі, і тады ўсе яны засяроджана лупілі, для Сініцы бананы, чысьцілі апельсіны, рэзалі яблыкі.

Калі Волечка зайшла да нас, Сініцы ў палаце не было – санітаркі яе дзеда пакуль што яшчэ не вярнулі. Аднак тут жа ўсьлед за дзяўчынкай, як усё роўна ведаючы, што старога чакаюць, шырока расчыніліся дзьверы і ўпусьцілі ў палату каталку з Сініцам. Калі санітаркі зноў выкуль-

валі на ложак Міхала Макаравіча, на паясьніцы ў яго мы ўбачылі невялікі квадрацік пластыра.

— Пункцыю бралі, — ці то нам, ці то сам сабе зазначыў Андрэй, але болей гаварыць нічога ня стаў, замоўк, сьцішыўся.

Мы з вялікай павагаю ставіліся да Сініцавай унучкі, і таму, калі яна прыходзіла, каб не замінаць Волечцы карміць дзеда, усе на той час знаходзілі свой клопат: Мікалаевіч шукаў недаразгаданыя красворды, Ігар нягучна ўключаў радыё ці маленькі тэлевізар, што стаяў каля яго на акне, Андрэй адварочваўся ў другі бок і ляжаў ціха, не варушачыся, хоць яму і было нязручна ляжаць на хворай руцэ.

Калі Волечка, з годнасьцю выканаўшы свой абавязак — паласаваць дзеда — ідзе дадому, першым звычайна азываецца Мікалаевіч — за месяц у ложку, на прывязі яму надакучыла ўсё, нават красворды, і ён спрабуе разгаварыць сябра па няшчасьці — памочніка машыніста:

— Ігар, а што гэта, калі цягнікі, сустрэўшыся, трубяць адзін аднаму, яны вітаюцца так?

— Не, Мікалаевіч, гэта яны кажуць адзін аднаму: «Паглядзі, ці ўсё ў мяне ўпарадку, ці не гарыць дзе што?» — адказвае Ігар і мацней уключае гук тэлевізара.

Мікалаевіч гэтак жа, як і Ігар, трапіў у аўтамабільную аварыю на сваёй машыне. І машына паламаная, і ён таксама.

Бачачы, што памочнік машыніста ўхіляецца ад размовы, Мікалаевіч зноў бярэцца за красворды. Але праз нейкі час адкладае газету, ня гледзячы, знаходзіць каля вуткі градуснік, і тыцкае яго сабе пад паху. Адразу ж дастае і войкае:

— Ой, а ў мяне тэмпература 37,5.

Усе маўчаць, і я маўчу.

Мікалаевіч зноў ставіць сабе тэрмометр, хутка вымае яго і занепакоена абвяшчае:

— Ой, а тэмпература ўжо 38,7.

«Гэта ўжо многа, — думаю я. — Гэта ўжо жар».

Але ўсе маўчаць — быццам бы і ня чуюць Мікалаевіча.

Я ж кульгаю на пост, клічу дзяжурную сястру. Тая прыходзіць, аднак і яна асабліва не хвалюецца, не мітусіцца. Проста кажа:

— Нічога страшнага, так і трэба, хутка сама пройдзе. І, нічога не зрабіўшы, выходзіць. Я адчуваю, што нечага не разумею, але ўсё роўна слухаю ўважліва і наступныя скаргі Мікалаевіча.

— Ой, а ў мяне шыйны пазванок...

— Ой, а ў мяне рука...

Калі ж Мікалаевіч расказвае мне, што ў яго нямеюць ногі, я, ужо разабраўшыся ў тым, што іншыя ведаюць даўно — Мікалаевіч вельмі надумлівы чалавек — гавару яму тое ж, што кажуць дактары і санітаркі:

— А што вы хочаце? Так і трэба — гэта ж столькі праляжаць на выцяжцы...

Да мяне неяк няёмячыся падыходзіць Сініца. Ведаючы, што Міхалам Макаравічам заву яго толькі я адзін, а астатнія альбо дзедам, альбо проста Мішам, ён шукае ў мяне абароны.

Яму не даюць прыкурыць. І я прашу Мікалаевіча, ў якога ёсць запальнічка, уважыць старога, даць яму аганьку. Той пстрыкае запальнічкай, дзед прыкурвае і ўжо кіруецца да дзьвярэй, кабісьці на лесьвічную пляцоўку, але яго пераймаюць дзьве прыгожыя санітарачкі — яны прыйшлі рабіць Сініцу масаж. Егер жартуе:

— Ідзі, Міша, ідзі пакуры, а я на гэты час на твой ложак лягу. Але Сініца тушыць цыгарэту і на свой ложак кладзецца сам.

Каб не глядзець у той кут, дзе маладыя дзяўчаты шчыруюць над дзевяностагадовым Сініцам, я адварочваю свой позірк убок і натыкаюся на ружу: яна ўжо другі тыдзень, як я тут, стаіць і не вяне — застаецца ўсё такой жа сьвежай, як і на пачатку. Пад ёй ніхто не мяняе вады, а яна буяе.

— Хто ж гэта вас, Мікалаевіч, так любіць, што такую прыгожую ружу прынёс?

Аднак замест суседа мне адказвае егер Андрэй:

— А гэтая кветка ня толькі Мікалаевічава. Яна — нашая. І вашая таксама.

Аказваецца, у траўматалогіі да мяне праводзіўся конкурс на лепшую па чысьціні і дружалюбнасьці палату, і яго выйграў наш пакой. І гэтая ружа — нам прыз, нам падарунак.

У гэтай палаце, з гэтымі дружалюбнымі людзьмі, якія ў такіх умовах перамаглі ў конкурсе, я праляжаў дзесяць дзён. Выпісваючы «для далечваньня па месцы жыхарства», мне зьнялі швы на галаве, але я застаўся ў гіпсе — ключыца зрасталася марудна — і з адкрытай гематомаю на назе, якая зьявілася пасьля моцнага ўдару.

Выпісвалі мяне разам з егерам. Андрэй, расчуліўшыся, гаварыў, што мы будзем прыязджаць, прыходзіць да іх, хто яшчэ застанецца пакуль што тут, але Мікалаевіч строга і рашуча адмовіўся ад нашых наведваньняў:

— Ня трэба. Цяпер мы самі па сабе, і вы — таксама самі сабою. А шкадаваць нас няма за што — нам і тут хараша.

Мікалаевіч вядома ж гаварыў такое ад крыўды. «Нам і тут хараша». Але ж прывязаны да ложка... Але ж даводзіцца спяшаючыся стукацець лыжкамі па жалезных частках ложку — каб хутчэй прыйшлі санітаркі і забралі вуткі... Не, да такога не прывыкнеш...

Таму Мікалаевіч, зразумела, хацеў пайсьці разам з намі. Ці хоць бы мы самі выбіраліся адсюль той жа момант — ня рвалі душу...

У яго вачах стаялі сьлёзы.

Я пажадаў усім, хто застаецца, як найхутчэй выйсьці здаровымі і больш сюды ніколі не вяртацца, і сам з невясёлым настроем выйшаў з палаты.

Азірнуўшыся, я чамусьці ўбачыў толькі ружу — быццам апрача яе у пакоі ўжо нікога і нічога не было...

У даведцы, якую выдалі мне ў траўматалогіі, было напісана: «Закрыты пералом правай ключыцы, вялікая скальпіраваная рана галавы, моцны ўдар правай голені, гематома».

Перад ад'ездам у Менск я усё ж наведаўся ў лес пад Вярхоўем — параненага, як і злачынцу на месца злачынства, цягне туды, дзе адбылося няшчасьце.

Нарэзаныя той дзень і пасьля здарэньня елкі папрыбіраныя і ўжо, мусіць, даўно на чужыне — у Фінляндыі. Толькі самотна мокне пад дажджом тоўсты кругляк з адзіным доўгім сукам, які выразалі тады лесарубы, каб вызваліць маю нагу і мяне самаго з-пад яліны. Калі нехта, нічога ня ведаючы пра прычыну яго зьяўленьня, убачыць катыш з такім сукам, зразумела зьдзівіцца: каму і навошта ён быў патрэбны?

Пакульгаў на тое месца, дзе я тады браў баравікі, і не пазнаў яго: божа, няўжо гэта тая мясьціна, якая здалася мне казачнай і дзе я той дзень быў такі радасны і такі шчасьлівы?!

Нейкая брудная, засьмечаная паляна, нейкі нязграбны хмызьняк, нейкія заняпалыя хвоі, якіх ня зрэзалі нават лесавалы...

У лесе ціха — не азываюцца бензапілы, нідзе не відно вальшчыкаў.

Не было ўжо лесарубаў і ў Зубрэвічах — на дзьвярах пустой, пакінутай хаты, у якой яны жылі, цяпер вісеў вялізны замок.

Кажуць, прадпрымальнік, пачуўшы, што яго рабочыя спусьцілі на чалавека елку, збаяўся, што давядзецца плаціць за паразу — ён жа ніяк не пазначыў, нічым не папярэдзіў, што тут ідзе валка лесу,— перавёў лесарубаў у другі лес, а гэты, пад Вярхоўем, пакінуў на потым – пакуль усё ўляжацца, устоіцца, забудзецца.

У Менску, калі хто, міжволі ўбачыўшы мае раны, мацаў карсет на маіх плячах і пытаўся, што здарылася, я, звычайна, адказваў гэтак жа, як і мой таварыш па палаце:

— Хадзіў на мядзьведзя. З рагацінай.

І дадаваў — для верагоднасьці:

— У Бабынавіцкім лясьніцтве. Каля Асінторфа. З егерам Андрэем Лабатым. І Таптун нас пабораў. Яму зламаў руку ў плячы. А са мною абыйшоўся вось гэтак.

І што дзіўна: кажучы так, я і сам напраўду верыў у гэта і на яве бачыў, як вялікі, касалапы, зьлямчаны ўвесь мядзьведзь, высалапіўшы язык, вырваўшы з маіх рук рагаціну, паволі, нібы нейкая бурая хмара, насоўваецца на мяне – усё бліжэй, бліжэй, бліжэй...

*2003 год.*